УДК 902/904

## ЗЕМЛЕМЕР И АРХЕОЛОГ АЛЕКСАНДР ЛЕОНТЬЕВИЧ АНИХОВСКИЙ: БЕЛОРУССКИЕ СТРАНИЦЫ БИОГРАФИИ

***А. В. ВАЙТОВИЧ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Исследуется вклад А. Л. Аниховского в развитие белорусской науки и культуры в 1918–1928 гг. До недавнего времени специалистам было известно о результатах его краеведческой и археологической деятельности исключительно в Оренбургском крае. Вклад А. Л. Аниховского в развитие белорусской археологии ошибочно приписывали его тезке – студенту Белорусского государственного университета, краеведу и педагогу А. Г. Аниховскому. В ходе изучения белорусских архивов было доказано, что именно А. Л. Аниховский проводил археологические работы на востоке Беларуси. Показываются этапы его профессионального пути. Реконструируются основные направления полевой археологической деятельности А. Л. Аниховского: составление плана Старого города в Минске, проведение археологических экспедиций на территории Верхнего Поднепровья, участие в обследовании пещер в ур. Дубки, осмотр городища и раскопки кургана в окрестностях д. Черкасово на Оршанщине, исследование курганов около д. Старые Прянички и д. Старый Дедин на Могилёвщине, изучение археологических древностей и поиск полезных ископаемых на территории Оренбургского края. Подчеркивается, что исследователь занимался популяризацией археологического наследия Беларуси, основал краеведческие музеи в Горках и Бугуруслане. Отмечается, что результаты научной деятельности археолога неоднократно подвергались критике. Несмотря на то что А. Л. Аниховский не являлся выдающимся полевым исследователем и не внес весомый вклад в разработку теоретических проблем науки, в своем стремлении заниматься археологической деятельностью он может стать примером для следующих поколений ученых.

***Ключевые слова:*** история археологии; краеведение; история музейного дела; Институт белорусской культуры; Беларусь; Оренбургский край.

***Благодарность.*** Автор высказывает признательность В. Н. Тарасевич, И. И. Баринову и А. И. Груше за помощь в подборе архивных материалов.

**Образец цитирования:**
Вайтовіч АУ. Землямер і археолаг Аляксандр Лявонцьевіч Аніхоўскі: беларускія старонкі біяграфіі. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2023; 4:115–129.
EDN: ZEVNYX

**For citation:**
Vaitovich AU. Land-surveyor and archaeologist Aljaksandr Ljavonc’evich Anihowski: Belarusian pages of biography. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2023;4: 115–129. Belarusian.
EDN: ZEVNYX

**Автор:**
***Александра Владимировна Вайтович*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета.

**Author:**
***Aliaksandra U. Vaitovich***, PhD (archaeology), docent; associate professor at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history.
*vaitovich.aliaksandra@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0002-8082-4215*

CC BY NC

# ЗЕМЛЯМЕР І АРХЕОЛАГ АЛЯКСАНДР ЛЯВОНЦЬЕВІЧ АНІХОЎСКІ: БЕЛАРУСКІЯ СТАРОНКІ БІЯГРАФІІ

***А. У. ВАЙТОВІЧ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Даследуецца роля А. Л. Аніхоўскага ў развіцці беларускай навукі і культуры ў 1918–1928 гг. Да нядаўняга часу спецыялістам было вядома аб выніках яго краязнаўчай і археалагічнай дзейнасці выключна ў Аранбургскім краі. Унёсак А. Л. Аніхоўскага ў развіццё беларускай археалогіі памылкова прыпісвалі яго цёзку – студэнту Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, краязнаўцу і педагогу А. Г. Аніхоўскаму. Падчас вывучэння беларускіх архіваў былі атрыманы сведчанні аб тым, што менавіта А. Л. Аніхоўскі праводзіў археалагічныя працы на ўсходзе Беларусі. Адлюстроўваюцца этапы яго прафесійнага шляху. Рэканструююцца асноўныя напрамкі палявой археалагічнай дзейнасці А. Л. Аніхоўскага: складанне плана Старога горада ў Мінску, правядзенне археалагічных экспедыцый на тэрыторыі Верхняга Падняпроўя, удзел у абследаванні пячор ва ўр. Дубкі, агляд гарадзішча і раскопкі кургана ў ваколіцах в. Чаркасова на Аршаншчыне, вывучэнне курганоў каля в. Старыя Пранічкі і в. Стары Дзедзін на Магілёўшчыне, вывучэнне археалагічных старажытнасцей і пошук карысных выкапняў на тэрыторыі Аранбургскага краю. Падкрэсліваецца, што навуковец дбаў аб папулярызацыі археалагічнай спадчыны Беларусі, заснаваў краязнаўчыя музеі ў Горках і Бугуруслане. Адзначаецца, што вынікі навуковай дзейнасці археолага неаднаразова падвяргаліся крытыцы. Нягледзячы на тое што А. Л. Аніхоўскі не з'яўляўся выбітным палявым даследчыкам і не зрабіў унёсак у распрацоўку тэарэтычных праблем археалогіі, у сваім імкненні займацца археалагічнай дзейнасцю ён можа стаць прыкладам для наступных пакаленняў навукоўцаў.

***Ключавыя словы:*** гісторыя археалогіі; краязнаўства; гісторыя музейнай справы; Інстытут беларускай культуры; Беларусь; Аранбургскі край.

***Падзяка.*** Аўтар выказвае шчырую падзяку В. М. Тарасевіч, І. І. Барынаву і А. І. Грушу за дапамогу ў падборы архіўных матэрыялаў.

# LAND-SURVEYOR AND ARCHAEOLOGIST ALJAKSANDR LJAVONC'EVICH ANIHOWSKI: BELARUSIAN PAGES OF BIOGRAPHY

***A. U. VAITOVICH***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The contribution of A. L. Anihowski to the development of Belarusian science and culture in 1918–1928 is investigated. Until recently, specialists were aware of the results of his local history and archaeological activities exclusively in the Orenburg region. A. L. Anihowski's contribution to the development of Belarusian archaeology was mistakenly attributed to his namesake – a student of the Belarusian State University, local historian and teacher A. G. Anihowski. During the study of the Belarusian archives, it was proved that it was A. L. Anihowski who carried out archaeological work in the east of Belarus. The stages of his professional path are shown. The main directions of A. L. Anihowski's field archaeological activity are reconstructed: drawing up a plan of the Old City in Minsk, conducting archaeological expeditions on the territory of the Upper Dnieper region, participating in the survey of caves in the Dubki tract, inspecting the settlement and excavating a mound in the vicinity of Charkasova village in the Orsha region, exploring mounds near the village Staryja Pranichki and village Stary Dzedzin. It is emphasised that the researcher was engaged in popularisation of the archaeological heritage of Belarus, he founded the museums of local lore in Gorki and Buguruslan. It is noted that the results of the archaeologist's scientific activity have been repeatedly criticised. Despite the fact that A. L. Anihowski was not an outstanding field researcher and did not make a significant contribution to the development of theoretical problems of science, in his desire to engage in archaeological activity, he can become an example for future generations of scientists.

***Keywords:*** history of archeology; local history; history of museology; Institute of Belarusian Culture; Belarus; Orenburg region.

***Acknowledgements.*** The author expresses sincere gratitude to V. M. Tarasevich, I. I. Barinov, A. I. Hrusha for their assistance in the finding of archival materials.

## Уводзіны

Неад'емнай часткай гісторыі археалогіі з'яўляюцца біяграфіі людзей, якія зрабілі ўнёсак у вывучэнне далёкай мінуўшчыны. Высвятленне лёсаў даследчыкаў не толькі дазваляе асэнсаваць адметныя рысы папярэдніх этапаў развіцця той ці іншай дысцыпліны, але і спрыяе паглыбленню рэфлексіі над

актуальным станам навукі. Асаблівую цікавасць выклікае час інстытуцыянальнага афармлення беларускай археалогіі, які прыйшоўся на супярэчлівую і трагічную эпоху паміж дзвюмя сусветнымі войнамі. Жыццё і дзейнасць многіх навукоўцаў міжваеннага перыяду добра вядомы грамадскасці. Аднак біяграфіі шэрагу краязнаўцаў патрабуюць удакладнення. Некаторыя імёны яшчэ чакаюць свайго вяртання з небыцця. Апошняе сцверджанне справядліва ў дачыненні да Аляксандра Лявонцьевіча Аніхоўскага – землямера, археолага і настаўніка.

На працягу дзесяцігоддзяў праца гэтага неардынарнага чалавека ў Інстытуце беларускай культуры (Інбелкульце), а таксама вынікі археалагічных даследаванняў, якія былі праведзены ім на ўсходзе Беларусі ў другой палове 1920-х гг., памылкова прыпісваліся яго цёзку – студэнту Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, краязнаўцу і педагогу Аляксандру Георгіевічу Аніхоўскаму[1]. Толькі ў 2021 г. імя Аляксандра Лявонцьевіча Аніхоўскага з’явілася на старонках беларускай археалагічнай літаратуры [1, с. 21, 78, 88].

Між тым памяць аб А. Л. Аніхоўскім, які ў розныя перыяды жыцця садзейнічаў развіццю археалогіі памежжа Расіі і Казахстана, руплівa зберагаецца краязнаўцамі, археолагамі і музейнымі супрацоўнікамі Горак (Беларусь), Аранбурга, Бугуруслана, Самары (Расія). Неаднойчы выходзілі з друку публікацыі, прысвечаныя таленавітаму спецыялісту[2] [2; 3, с. 34–35; 4, с. 99–102]. Аднак гэтыя даследаванні не з’яўляюцца вычарпальнымі. Па-першае, большасць біяграфічных нарысаў грунтуецца на звестках, прадстаўленых у дакументах, якія былі створаны пасля 1928 г. і якія сёння захоўваюцца ў Бугуруслане. Праведзенае аўтарам вывучэнне матэрыялаў беларускіх архіваў дало падставы сцвярджаць, што А. Л. Аніхоўскі, запаўняючы на мяжы дзесяцігоддзяў абавязковы для таго часу працоўны спіс (аналаг сучаснай працоўнай кніжкі), не ўзгадаў некаторыя важныя факты сваёй біяграфіі. Па-другое, апублікаваныя працы асвятляюць толькі асноўныя вехі пакручастага лёсу даследчыка. Па-за ўвагай спецыялістаў застаюцца шматлікія дэталі, зварот да якіх дазволіў бы за энцыклапедычнай характарыстыкай «ученого археолога и инженера по земельной регистрации»[3] ўбачыць жывога чалавека – сведку складаных перыядаў гісторыі нашай краіны. Узгаданыя акалічнасці абумовілі мэту артыкула – вызначэнне ролі А. Л. Аніхоўскага ў развіцці беларускай навукі і культуры ў 1918–1928 гг.

## Горкі – Аранбург – Саратаў – Яраслаўль – Мышкін

Ва ўсіх біяграфічных нарысах адзначаецца, што А. Л. Аніхоўскі нарадзіўся 19 (31) студзеня 1876 г. З фармулярнага спіса (1912) Яраслаўскай губернскай чарцёжнай землеўпарадкавальнай камісіі вынікае, што будучы даследчык старажытнасцей з’явіўся на свет у студзені 1871 г.[4] Дзяцінства і юнацтва ён правёў у Горках Магілёўскай губерні. «Як беларус, я люблю сваю бацькаўшчыну»[5], – прызнаваўся навуковец праз шмат дзесяцігоддзяў[6].

У пачатку 1890-х гг. юнак скончыў Гора-Горацкія землямерна-таксатарскія класы, атрымаўшы кваліфікацыю землямера і таксатара (лясніка-ацэншчыка). У 1893 г. ён «вступил рядовым на правах вольноопределяющагося 1-го разряда в 1-й Пехотный Невский Его Величества Короля Эллинов Полк»[7], гарнізон якога ў той час размяшчаўся ў Раслаўлі – невялікім гарадку побач са Смаленскам[8]. Праз год А. Л. Аніхоўскі здаў іспыт на «чин прапорщика запаса» і быў звольнены ў запас[9]. Пасля гэтага малады чалавек паступіў на грамадзянскую службу ў Бабруйску (мал. 1), а неўзабаве заключыў шлюб з дваранкай праваслаўнага веравызнання Ганнай Пятроўнай Шульцавай[10].

У лютым 1899 г. А. Л. Аніхоўскі быў прызначаны тапографам Тургайскай часовай партыі па нарыхтоўцы перасяленчых і запасных участкаў уздоўж лініі Заходне-Сібірскай чыгункі[11]. На працягу чатырох гадоў ён падарожнічаў па тургайскіх стэпах,

---

[1] *Віцязь С. П., Мядзведзева В. У., Дучыц Л. У.* Даследчыкі археалагічных старажытнасцей Беларусі : біябібліягр. давед. Мінск : Беларус. навука, 2020. С. 425–426.

[2] *Мишанина Е. В.* Оренбургский археолог Александр Леонтьевич Аниховский (1876–1939) // XXI Уральское археологическое совещание, посвященное 85-летию со дня рождения Г. И. Матвеевой и 70-летию со дня рождения И. Б. Васильева : материалы Всерос. науч. конф. / под ред. А. А. Выборнова. Самара : Изд-во СГСПУ, 2018. С. 337–340 ; *Лившиц В. М.* Имя выпускника Горецких землемерно-таксаторских классов на географической карте России // Бацькаўшчына : зб. матэрыялаў раён. краязн. канф., Горкі, 15 снежня 2016 г. / пад рэд. Г. А. Гусарава. Горкі : БДСГА, 2017. С. 34–37.

[3] Філ. дзярж. бюджэт. установы «Аб’яднаны дзяржаўны архіў Аранбургскай вобласці» у Бугуруслане (далей – Філіял ДБУ «АДААВ» у Бугуруслане). Ф. 421. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 2 зв.

[4] Цэнтр. дзярж. арх. г. Масквы (далей – ЦДА Масквы). Ф. 376. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 2 зв.

[5] Тут і далей цытаты і некаторыя крыніцы прыводзяцца з захаваннем моўных асаблівасцей арыгінала.

[6] Нац. арх. Рэсп. Беларусь (НАРБ). Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1935. Арк. 45 зв.

[7] ЦДА Масквы. Ф. 376. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 2 зв., 3.

[8] *Акимов М. В.* Герои былых времен. Краткий боевой путь 1-го, 2-го пехотных и 5-го, 6-го гренадерских полков // Воен.-ист. журн. 2020. № 12. С. 31–39.

[9] ЦДА Масквы. Ф. 376. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 2 зв., 3.

[10] Там жа. Арк. 3. Іншыя звесткі аб членах сям’і А. Л. Аніхоўскага выяўлены не былі. Можна толькі адзначыць, што ў 1941 г. у Бугурусланскім краязнаўчым музеі, заснаваным Аляксандрам Лявоньцьевічам, працавала «таварыш Аніхоўская» – магчыма, жонка ці дачка героя артыкула. (Філіял ДБУ «АДААВ» у Бугуруслане. Ф. 421. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 4.)

[11] ЦДА Масквы. Ф. 376. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 2, 2 зв., 3 зв., 4.



*Мал. 1.* А. Л. Аніхоўскі падчас службы ў Бабруйску. Фатаграфія.
К р ы н і ц а: Філіял ДБУ «АДААВ» у Бугуруслане.
Ф. 421. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 4

*Fig. 1.* A. L. Anihowski during the civil service in Babrujsk. Photo.
S o u r c e: Branch of the State Budg. Inst. «Unified State Archive of the Orenburg region» in Buguruslan.
Fund 421. Invent. 1. Folder 8. P. 4

займаючыся межаваннем зямлі і складаннем карт і планаў. Карпатлівая праца маладога чалавека не засталася незаўважанай: адзін з пасёлкаў, заснаваных перасяленцамі, атрымаў сваю назву ў гонар руплівага землямера[12]. Сёння с. Аніхоўка з'яўляецца цэнтрам сельсавета ў Адамаўскім раёне Аранбургскай вобласці Расіі.

У жніўні 1903 г. таленавіты тапограф перайшоў на працу ў Аранбургскае аддзяленне Сялянскага пазямельнага банка і заняў пасаду памочніка справавода. У адпаведнасці са штатным раскладам ён «производил в натуре различного рода межевые работы… а также составлял, вычислял и копировал планы»[13].

Інтарэсы А. Л. Аніхоўскага не зводзіліся выключна да працоўных абавязкаў. Праз некалькі гадоў ён узгадваў: «…в Тургайской области… натолкнулся на множество древних курганов, сильно меня заинтересовавших. Это обстоятельство послужило толчком к тому, что с тех пор я все свое свободное от службы время посвящал археологии»[14].

Пачатак краязнаўчай і археалагічнай дзейнасці А. Л. Аніхоўскага неаднаразова выклікаў увагу даследчыкаў [2; 4, с. 99–102]. Аднак варта ўпарадкаваць сучасныя ўяўленні аб гэтай важнай частцы жыцця аранбургскага землямера. У 1901 г. Аляксандр Лявонцьевіч быў абраны сапраўдным сябрам Аранбургскай вучонай архіўнай камісіі[15] (АВАК), аднаго з самых аўтарытэтных краязнаўчых таварыстваў Расійскай імперыі, і адразу далучыўся да яго працы.

У 1902 г. Імператарская археалагічная камісія (ІАК) выдала АВАК дазвол на правядзенне раскопак у межах Кустанайскага павета Тургайскай вобласці. Па рашэнні АВАК гэты дазвол быў перададзены А. Л. Аніхоўскаму [5, с. 221]. Перад маладым аматарам мінуўшчыны стаяла складаная задача: ва ўмовах адсутнасці фінансавання правесці даследаванне вялікага кургана сармацкай эпохі ў с. Красначорскае Аранбургскай губерні. Незаконныя раскопкі кургана ўжо былі распачаты мясцовымі жыхарамі. А. Л. Аніхоўскі зачысціў і паглыбіў шурф, зроблены казакамі, апісаў стратыграфію насыпу, зрабіў некалькі фотаздымкаў помніка і знойдзеных артэфактаў [4, с. 119–120; 6, с. 386–387]. Па выніках працы Аляксандр Лявонцьевіч падрыхтаваў справаздачу для ІАК [5, с. 221].

Справаздачная дакументацыя трапіла ў рукі вядомага археолага А. А. Спіцына. Азнаёміўшыся з матэрыяламі, ён пакінуў прыпіску на адным з малюнкаў: «NB! По предположению А. Л., когда все слои будут вынуты, должна образоваться воронка» [6, с. 388]. Зразумеўшы, што недасведчаны краязнавец не здолее правесці раскопкі помніка на належным узроўні, А. А. Спіцын рэкамендаваў ІАК даручыць далейшае вывучэнне кургана слухачу Маскоўскага археалагічнага інстытута (МАІ) М. Е. Макаранку [6, с. 388]. М. Е. Макаранка, у будучым вядомы ўкраінскі даследчык, завяршыў раскопкі кургана і пры гэтым аспрэчыў высновы, зробленыя А. Л. Аніхоўскім[16].

Крытычныя заўвагі спецыялістаў не сталі перашкодай для маладога даследчыка. Па выніках першага палявога сезона ён падрыхтаваў невялікі артыкул[17] і працягнуў археалагічнае вывучэнне Тургайскай вобласці. У 1903 г. А. Л. Аніхоўскі зноў атрымаў дазвол на правядзенне даследаванняў і прыступіў да раскопак курганоў ва ўр. Жангыз-Агаш Акцюбінскага павета. Тапографа і краязнаўца зацікавілі аб'екты, якія з пункту гледжання сучаснай навукі ўяўлялі сабой рэшткі сярэднявечнага маўзалея. А. Л. Аніхоўскі расчысціў два курганы, апісаў канструкцыі пахавальных збудаванняў, занатаваў мясцовыя легенды, звязаныя з помнікам, і асаблівасці пахавальнага абраду. Справаздача аб выніках даследаванняў была апублікавана ў працах АВАК[18], аднак так і не была прадстаўлена ў ІАК [5, с. 222].

---

[12]*Мишанина Е. В.* Оренбургский археолог Александр Леонтьевич Аниховский (1876–1939). С. 337 ; *Лившиц В. М.* Имя выпускника Горецких землемерно-таксаторских классов … С. 34–37.

[13]ЦДА Масквы. Ф. 376. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 3 зв.

[14]Цэнтр. навук. арх. Нац. акад. навук Беларусі (ЦНА НАНБ). Ф. 67. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 38.

[15]Действительные члены // Тр. Оренбург. учен. арх. комис. (далее – Труды ОУАК). 1903. Вып. 11. С. 134.

[16]*Макаренко Н. Е.* Продолжение раскопки кургана около поселка Красногорского Оренбургского уезда // Там же. 1906. Вып. 16. С. 76–88.

[17]*Аниховский А. Л.* Раскопки кургана в поселке Красногорском // Там же. С. 69–76.

[18]*Он же.* Раскопка древних курганов-могильников в Тургайской области, в Актюбинском уезде // Там же. 1914. Вып. 14. С. 66–79.

Руска-японская вайна спыніла размеранае жыццё. Прапаршчык запасу А. Л. Аніхоўскі 5 чэрвеня 1904 г. быў мабілізаваны на службу ў 310-ы пяхотны Сцерлітамакскі полк. Яго адразу прызначылі «адъютантом 3 баталиона», а ў студзені 1905 г. перавялі на пасаду «полкового адъютанта». Падчас вайсковай службы краязнавец займаўся суправаджэннем эшалонаў[19]. Службовыя паездкі не перашкаджалі яму знаходзіць час на любімую справу. У пачатку 1905 г. А. Л. Аніхоўскі прыняў удзел у пасяджэнні АВАК[20]. У маі гэтага ж года Аляксандр Лявонцьевіч па стану здароўя выйшаў у адстаўку[21]. Пасля кароткага адпачынку ён вярнуўся да працы ў банку, а ў хуткім часе разгарнуў кіпучую дзейнасць на ніве краязнаўства і археалогіі.

Яшчэ ў 1904 г. АВАК пастанавіла прыступіць да складання археалагічнай карты Тургайскай вобласці. Важная роля ў рэалізацыі праекта адводзілася менавіта А. Л. Аніхоўскаму[22]. Нягледзячы на недахоп сродкаў [4, с. 94], дасведчаны землямер здолеў за некалькі гадоў выканаць значную частку прац «по составлению планшетов с картой Кустанайского уезда»[23]. У 1907 г. згодна з рашэннем АВАК да стварэння «карты курганов» далучыліся яшчэ два тапографы[24]. Археалагічная карта Тургайскай вобласці, складзеная пад кіраўніцтвам А. Л. Аніхоўскага, не была надрукавана, тым не менш у студзені 1908 г. на пасяджэнні АВАК Аляксандр Лявонцьевіч выступіў з дакладам аб курганах у Аранбургскай губерні і Тургайскай вобласці[25] [4, с. 102]. У жніўні 1907 г. матэрыялы, сабраныя аранбургскімі тапографамі, былі прадстаўлены сябрамі камісіі М. Е. Макаранкам і П. А. Нязнамавым на 14-м археалагічным з'ездзе ў Чарнігаве[26]. З падрыхтоўкай да важнага навуковага мерапрыемства дапамагаў А. Л. Аніхоўскі, менавіта ён зрабіў макеты мясцовых курганоў[27].

Значную ўвагу краязнаўцаў нязменна прыцягваў папулярызатарскі накірунак дзейнасці. У 1906 г. аранбургская інтэлігенцыя звярнулася да А. Л. Аніхоўскага з просьбай «принять на себя труд заведованием музея»[28]. Аляксандр Лявонцьевіч падыйшоў да даручанай яму справы надзвычай адказна[29]. У 1908 г. сябры камісіі адзначалі: «Музей приведен в порядок… и появилась надежда на осуществление мечты о постройке обширного для Музея помещения»[30].

Руплівы даследчык мінуўшчыны не забываў і аб асветніцкіх магчымасцях друкаванага слова. Пазней ён узгадваў: «…мелкие… заметки с описанием произведенных мной раскопок, обследований памятников старины и др. были помещены в разное время в “Оренбургской газете”, в “Степном крае”, в “Тургайской газете”, в “Известиях Туркестанского кружка любителей археологии” и др.»[31].

У публікацыях А. Л. Аніхоўскі мэтанакіравана не ўзнімаў пытанне аб гістарычных рэканструкцыях[32]. Верагодна, ён усведамляў абмежаванасць сваіх уяўленняў аб мясцовай гісторыі. Нельга не прызнаць, што адмыслоўцу відавочна бракавала ведаў у галіне археалогіі, перш за ўсё ў метадыцы палявых даследаванняў. У красавіку 1908 г. А. Л. Аніхоўскі выступіў на пасяджэнні АВАК з дакладам аб выніках «случайных раскопок» кургана каля пас. Давыдзенкаўскі Кустанайскага павета[33]. Ён паведаміў, што была разрыта толькі частка насыпу, і абмежаваўся апісаннем знешняга выгляду і памераў помніка. Працы праводзіліся без дазволу, справаздачныя матэрыялы не былі прадстаўлены ні ў АВАК, ні ў ІАК[34] [5, с. 224].

У сакавіку 1908 г. Аляксандр Лявонцьевіч быў пераведзены на пасаду справавода Саратаўскага аддзялення Сялянскага пазямельнага банка[35]. Пераезд і новыя службовыя абавязкі не спынілі актыўнай краязнаўчай дзейнасці А. Л. Аніхоўскага. Ён не толькі застаўся дзейсным сябрам АВАК[36], але і быў абраны сябрам Саратаўскай вучонай архіўнай камісіі[37]. Навуковец далучыўся да фарміравання калекцый музея

[19]ЦДА Масквы. Ф. 376. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 3 зв., 4, 4 зв., 5.
[20]Протокол № 1. Очередное заседание 10 января 1905 г. // Труды ОУАК. 1906. Вып. 16. С. 240–242.
[21]ЦДА Масквы. Ф. 376. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 4 зв., 5.
[22]Протокол № 2. Очередное заседание 31 января // Труды ОУАК. 1906. Вып. 16. С. 4.
[23]Протоколы заседаний за 1901–1907 гг. и отчет за 1907 год (рассмотрены редакционным комитетом) // Оренбург. учен. арх. комис. Оренбург : Типолитогр. Б. А. Бреслина, 1909. С. 35–36.
[24]Там же ; Отчет и протоколы заседаний за 1908 год / сост. Н. А. Незнамов. Оренбург : Скоропечатня З. Озерьер, 1909. С. 57.
[25]Отчет и протоколы заседаний за 1908 год. С. 36–41.
[26]Там же. С. 59–60.
[27]Там же. С. 61.
[28]Протокол № 4. Очередное заседание 15 марта // Труды ОУАК. 1907. Вып. 19. С. 33.
[29]Протокол № 8. Очередное заседание 16 мая // Там же. С. 39–45.
[30]Філіял ДБУ «АДААВ» у Бугуруслане. Ф. 421. Оп. 1. Спр. 5. Арк. 1.
[31]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 38.
[32]*Аниховский А. Л.* Древние курганы-могильники в Кустанайском уезде Тургайской области // Труды ОАУК. 1905. Вып. 14. С. 53.
[33]Отчет и протоколы заседаний за 1908 год // Отчет о деят. и состоянии Оренбург. учен. арх. комис. за 1908 г. / сост. П. А. Незнамов. Оренбург : Скоропечатня З. Озерьер, 1909. С. 52.
[34]*Кастанье И. А.* Древности Киргизской степи и Оренбургского края // Труды ОУАК. 1910. Вып. 22. С. 69–70.
[35]ЦДА Масквы. Ф. 376. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 4 зв., 5.
[36]Список членов Оренбургской ученой архивной комиссии за 1913 г. // Труды ОУАК. 1916. Вып. 33. С. 12.
[37]Список членов Саратовской губернской ученой архивной комиссии на 1-е июля 1909 г. // Тр. Сарат. учен. арх. комис. 1909. Вып. 25. С. 97.

ў Саратаве[38], а таксама знаходзіў час на вывучэнне археалогіі рэгіёна. У 1909 г. А. Л. Аніхоўскі перадаў у музей Аранбурга керамічны посуд, знойдзены «на месте бывшаго татарского городка “Увек”»[39]. Відавочна, няўрымслівы аматар мінуўшчыны не мог не наведаць самы вядомы на той час помнік Самарскага краю – гарадзішча, якое засталося ад золатаардынскага горада Укек [7].

У студзені 1909 г. Аляксандр Лявонцьевіч атрымаў прызначэнне ў Яраслаўскае аддзяленне Сялянскага пазямельнага банка. З’яўляючыся дасведчаным спецыялістам, ён некаторы час працаваў справаводам і старэйшым кантралёрам, а ў чэрвені 1912 г. заняў пасаду старэйшага землямера землеўпарадкавальных камісій Яраслаўскай губерні[40]. Паступовае прасоўванне даследчыка па кар’ернай лесвіцы не перашкаджала яго заняткам археалогіяй. У 1912 г. у Яраслаўлі адкрыўся філіял МАІ [8], куды А. Л. Аніхоўскі паступіў на археалагічнае аддзяленне (мал. 2). «Любоў к старыне перакінула мяне з аматара ў спецыялістага», – так праз паўтара дзесяцігоддзя ён апісваў гэты перыяд свайго жыцця[41].



*Мал. 2.* А. Л. Аніхоўскі – слухач Яраслаўскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута. Фатаграфія.
Крыніца: ЦДА Масквы. Ф. 376. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 9 зв.
*Fig. 2.* A. L. Anihowski as a student of Yaroslavl’ department of Moscow Archaeological Institute. Photo.
Source: Cent. State Arch. of Moscow. Fund 376. Invent. 1. Folder 117. P. 9 back

Неабходна падкрэсліць, што дзейнасць археалагічных інстытутаў была накіравана перш за ўсё на падрыхтоўку кадраў для архіваў, бібліятэк і музеяў [8, с. 198–199]. Навучальныя ўстановы давалі толькі базавыя тэарэтычныя веды ў галіне археалогіі. Гэта падцвярджае і асабістая справа А. Л. Аніхоўскага, што захавалася ў фондзе МАІ. Згодна са статутам інстытута Аляксандр Лявонцьевіч, які не меў вышэйшай адукацыі, быў прыняты на навучанне вольным слухачом[42]. Дасведчанаму аматару мінуўшчыны вучоба давалася лёгка: у кніжцы слухача стаяць толькі выдатныя адзнакі. У адпаведнасці з праграмай А. Л. Аніхоўскі праслухаў шэраг спецыяльных гістарычных дысцыплін і ўсяго тры курсы археалагічнага профілю: па гісторыі археалагічных адкрыццяў, першабытнай археалогіі і хрысціянскай археалогіі[43]. У канцы 1915 г. ён скончыў навучанне са званнем вучонага археолага і быў залічаны ў сапраўдныя сябры МАІ[44].

Атрыманне гуманітарнай адукацыі не ўнесла істотных карэктываў у жыццё А. Л. Аніхоўскага. У 1916 г. ён перайшоў на пасаду неадменнага сябра Мышкінскай землеўпарадкавальнай павятовай камісіі Яраслаўскай губерні[45]. У маленькім павятовым гарадку Мышкіне Аляксандр Лявонцьевіч сустрэў Лютаўскую рэвалюцыю. У сакавіку 1917 г. ён узначаліў Мышкінскі павятовы зямельны камітэт, аднак неўзабаве вырашыў вярнуцца ў горад юнацтва.

## Горкі

Жыццё на новым месцы і ў новых грамадска-палітычных абставінах наладжвалася няпроста. Пазней А. Л. Аніхоўскі адзначаў: «Вследствие временной приостановки землеустройства перешел на педагогическую деятельность»[46]. У верасні 1918 г. Аляксандр Лявонцьевіч пачаў працаваць настаўнікам Горацкай школы другой ступені. У хуткім часе яго прызначылі старшынёй школьнай педагагічнай рады (кажучы сучаснай мовай, дырэктарам), а праз год – загадчыкам адзінай працоўнай школы пры Горацкім павятовым аддзеле народнай адукацыі. Акрамя таго, вучоны археолаг вёў вячэрнія школьныя курсы для дарослых, а таксама выкладаў на двухгадовых педагагічных курсах[47].

Гэты перыяд жыцця А. Л. Аніхоўскага адлюстраваны ў мемуарах яго вучня – пісьменніка Л. Э. Разгона. У краязнаўчай літаратуры[48] неаднойчы прыводзілася характарыстыка, дадзеная літаратарам

[38]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 6. Арк 38.
[39]Список пожертвований // Труды ОУАК. 1911. Вып. 23. С. 274.
[40]ЦДА Масквы. Ф. 376. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 5 зв., 6.
[41]НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1935. Арк. 45 зв.
[42]ЦДА Масквы. Ф. 376. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 5 зв., 6.
[43]Там жа. Арк. 27 зв. – 30.
[44]НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1935. Арк. 45 зв.
[45]Там жа. Арк. 4 зв., 5.
[46]Там жа. Арк. 5.
[47]Там жа. Арк. 5 ; Там жа. Арк. 45, 47 зв., 48.
[48]*Лившиц В. М.* Имя выпускника Горецких землемерно-таксаторских классов ... С. 35.

свайму настаўніку: «Высокий, с рыжими тараканьими усами, всегда ходивший в прекрасно сохранившейся форменной тужурке – он казался ожившей иллюстрацией к романам, повестям, воспоминаниям о царской классической гимназии»[49].

Як дырэктар адукацыйнай установы, А. Л. Аніхоўскі павінен быў забяспечваць адпаведнасць навучальнага працэсу і грамадскага жыцця школы патрабаванням савецкай улады. Кіраўніцтва Горацкага павятовага аддзела народнай адукацыі высока ацэньвала дзейнасць свайго супрацоўніка: «…безвозмезно и охотно участвовал во всякого рода комиссиях, советах, конференциях и других организациях по вопроса направления школ… по пути осуществления новых начал и принципов в деле просвещения и воспитания молодежи»[50]. Прыстасоўваючыся да паслярэвалюцыйных рэалій, А. Л. Аніхоўскі тым не менш даволі выразна дэманстраваў старарэжымныя погляды. «В школе не было не только комсомольской ячейки, но и ни одного комсомольца. Все старые формы чинопочитания по отношению к учителям, а особливо к заведующему, соблюдались неукоснительно», – адзначаў пазней былы вучань Аляксандра Лявонцьевіча[51].

А. Л. Аніхоўскі выкладаў дысцыпліну «Гісторыя культуры». Варта зноў працытаваць Л. Э. Разгона: «Никаких учебников по этому предмету не было, и занятия сводились к тому, что из года в год Анеховский [Аниховский] диктовал своим ученикам курс, начинавшийся со слов: “История культуры есть сумма труда человеческого…”. <…> Но вспоминая его, его увлекательные рассказы о дворцах (он называл их “палаццо”) и храмах (они у него именовались “культовые сооружения”), я понимаю, что это была отчаянная попытка вбить в наши замусоренные головы то, что вечно»[52].

На занятках Аляксандр Лявонцьевіч разважаў і аб археалогіі. Яго своеасаблівыя аповеды добра запомніліся вучням: «Рассказывая о том, как по остаткам материальной культуры устанавливается культурный уровень народа и его государственного строя, Анеховский [Аниховский] обязательно доставал из кармана два карандаша и, поигрывая золотым пенсне на длинном черном шнурке, говорил: “Представьте себе, что будущие археологи найдут вот этот фаберовский карандаш и по нему станут определять степень культурности строя, при котором он был создан. Они увидят, как тщательно он сделан… Они поймут, что такой карандаш мог быть создан только в государстве, стоящем на высокой ступени культуры. А потом они найдут вот этот советский карандаш – он с гримасой отвращения вытаскивал некрашеный карандаш – и увидят, как он примитивен… и они сделают вывод о состоянии культуры…”»[53].

Горацкія школьнікі, незадаволеныя пазіцыяй свайго настаўніка, неаднаразова скардзіліся на яго павятовым і губернскім уладам. Чыноўнікі займалі аднадушную пазіцыю: «…заведующий большой специалист, а взгляды его не имеют существенного значения»[54]. Можна меркаваць, што такая лаяльнасць, яшчэ магчымая ў тыя гады, была абумоўлена не столькі разнапланавымі ведамі, набытымі А. Л. Аніхоўскім у дарэвалюцыйны час, колькі ўнёскам кваліфікаванага тапографа і дыпламаванага археолага ў культурнае будаўніцтва савецкага горада.

У 1919 г. Горацкі павятовы аддзел народнай адукацыі даручыў Аляксандру Лявонцьевічу стварыць «натуральна-гістарычны музей»[55]. Маючы шматгадовы досвед музейнай працы, адмысловец справіўся з гэтай задачай. Музейныя фонды, як пазней заўважаў А. Л. Аніхоўскі, былі «сабраны бяз капейкі грошай»[56]. Аснову калекцый склалі каштоўнасці, вывезеныя з нацыяналізаванага маёнтка «Раманава», якія належыў роду князёў Дандуковых-Корсакавых. Усяго ў зборы трапілі «некалькі тысяч прадметаў»[57], у тым ліку больш за 50 твораў жывапісу і графікі заходнееўрапейскіх і рускіх мастакоў, шматлікія ўзоры ўсходняга дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама бронзавыя лямпы, медалі, гадзіннікі, старажытная зброя, рыштунак і інш.[58] Музей карыстаўся папулярнасцю сярод гараджан, у першую чаргу сярод дзяцей і студэнцкай моладзі. «Все то, что было доступно только богачам, стало возможным для всех. <…> И мы могли смотреть на эти вещи, любоваться картинами, трогать (тайком от служителя музея) мягкий ворс бархата, кружевную насечку на пистолетах», – узгадваў Л. Э. Разгон[59].

У 1923 г. музей спыніў сваё існаванне. Як пазней абураўся А. Л. Аніхоўскі, пасля далучэння Горацкага

---

[49] *Разгон Л.* Позавчера и сегодня. Повесть о жизни. М. : [б. и.], 1995. С. 156.
[50] НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1935. Арк. 47 зв.
[51] *Разгон Л.* Позавчера и сегодня … 1995. С. 156.
[52] Там жа. С. 160.
[53] Там жа. С. 156.
[54] Там жа.
[55] Філіял ДБУ «АДААВ» у Бугуруслане. Ф. 421. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 4 зв., 5.
[56] НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1935. Арк. 45 зв.
[57] Там жа.
[58] *Казанцева М. В.* Из опыта реконструкции коллекции фарфора Белорусского государственного музея 20-х гг. XX в. (на примере коллекции князей Дондуковых-Корсаковых) // София. 2017. № 2. С. 19–24 ; *Кольчевская И. Е.* Утраченные ценности: наследие князей Дондуковых-Корсаковых // Бацькаўшчына : зб. матэрыялаў VII Рэсп. краязн. канф., Горкі, 22 снеж. 2020 г. / пад рэд. Н. С. Шатраўка. Горкі : БДСГА, 2021. С. 76–81.
[59] *Разгон Л.* Позавчера и сегодня … 1995. С. 166.

павета да Смаленскай губерні «пра сабраныя... цэннасці даведаўся Смаленск і адабраў лепшую частку іх»[60]. Так найбольш значныя калекцыі апынуліся ў фондах Смаленскага губернскага музея[61]. Адзінкавыя прадметы засталіся ў Горках. Дзякуючы намаганням былога загадчыка яны ў 1925 г. паступілі ў фонды Беларускага дзяржаўнага музея[62].

А. Л. Аніхоўскі пасля расфарміравання музея ў чарговы раз быў вымушаны мяняць планы. Восенню 1923 г. ён пачаў выкладаць у Горацкім землямерназемлеўпарадкавальным тэхнікуме пры Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце. На працягу трох семестраў дасведчаны спецыяліст чытаў лекцыі па кадастрах, зямельнай рэгістрацыі і тапаграфічным чарчэнні[63]. Не заставаўся ён у баку і ад грамадскага жыцця. Так, восенню 1924 г. Аляксандр Лявонцьевіч неаднаразова ездзіў у Мінск, дабіваючыся ад Інбелкульта прызначэння пенсіі ўдаве вядомага аграбіёлага М. В. Рытава[64].

У снежні 1924 г. А. Л. Аніхоўскі быў запрошаны ў сталіцу на пасаду загадчыка курсаў па перападрыхтоўцы землеўпарадкавальнікаў пры Народным камісарыяце земляробства (Наркамземе) БССР. Праз тры гады ён уладкаваўся статыстыкам – інструктарам па землеўпарадкавальнай статыстыцы пры Цэнтральным статыстычным упраўленні БССР[65]. Менавіта з Мінскам звязаны адзін з найбольш яркіх і найменш даследаваных перыядаў жыцця Аляксандра Лявонцьевіча.

## Мінск

Пераезд у сталіцу адкрываў перспектывы вяртання да ўлюбёнага занятку – археалагічных даследаванняў. А. Л. Аніхоўскі прыклаў усе намаганні, каб здзейсніць сваю мару. У маі 1925 г. ён звярнуўся ў Інбелкульт з просьбай прыняць яго ў якасці сябра археалагічнай камісіі. Дакумент быў адпраўлены на разгляд сакратару камісіі В. Д. Дружчыцу[66]. У жніўні 1925 г. навуковец перадаў у дэканат педагагічнага факультэта БДУ заяву «аб прадстаўленні яму пасады асістэнта па катэдры археалогіі»[67]. Прарэктар БДУ С. З. Кацэнбоген, на якога ўсклалі абавязак вырашэння пытання аб працаўладкаванні А. Л. Аніхоўскага, у той час знаходзіўся ў камандзіроўцы і змог азнаёміцца з дасланымі паперамі толькі ў кастрычніку[68]. Не чакаючы адказу ад БДУ, Аляксандр Лявонцьевіч праінфармаваў Інбелкульт аб сваім жаданні далучыцца да дзейнасці этнаграфічнай секцыі[69].



*Мал. 3.* Супрацоўнікі гістарычна-археалагічнай камісіі Інбелкульта. Фатаграфія.
Сядзяць (злева направа): Д. І. Даўгяла, М. В. Доўнар-Запольскі, І. А. Сербаў.
Стаяць (злева направа): С. А. Дубінскі, А. М. Паноў, П. В. Харламповіч, А. Л. Аніхоўскі. 1926.
Крыніца: Беларус. дзярж. арх. кінафотафонадак. E031533

*Fig. 3.* Employees of the historical and archaeological commission of Institute of Belarusian Culture. Photo.
Seated (left to right): D. I. Dawgjala, M. V. Downar-Zapol'ski, I. A. Serbaw.
Stand (left to right): S. A. Dubinski, A. M. Panow, P. V. Harlampovich, A. L. Anihowski. 1926.
Source: Belarus. State Arch. of Film and Photo Document. E031533

Нарэшце бюракратычныя працэдуры завяршыліся, і 10 лістапада 1925 г. А. Л. Аніхоўскі быў прыняты ў склад гістарычна-археалагічнай камісіі Інбелкульта[70] (мал. 3). Па стану на 1 кастрычніка 1926 г. Аляксандр Лявонцьевіч з'яўляўся адным з «абраных супрацоўнікаў» камісіі[71]. У адпаведнасці з тагачаснай практыкай гэта азначала, што навуковец працаваў у галоўнай навукова-асветніцкай установе рэспублікі на добраахвотных пачатках, не атрымліваючы аплаты[72].

[60]НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1935. Арк. 45 зв.
[61]*Казанцева М. В.* Из опыта реконструкции коллекции фарфора ... С. 19–24 ; *Кольчевская И. Е.* Утраченные ценности: наследие князей Дондуковых-Корсаковых. С. 76–81.
[62]НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1935. Арк. 45 зв. ; Пополнение государственного музея // Звезда. 1925. 14 февр. С. 4.
[63]Філіял ДБУ «АДААВ» у Бугуруслане. Ф. 421. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 5 зв., 6.
[64]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 247.
[65]Філіял ДБУ «АДААВ» у Бугуруслане. Ф. 421. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 5 зв., 6.
[66]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 38.
[67]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 801. Арк. 166.
[68]Там жа. Спр. 824. Арк. 112.
[69]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 145.
[70]Там жа. Спр. 23. Арк. 156.
[71]Там жа.
[72]*Груша А. И.* Уникальность Института белорусской культуры // Наука и инновации. 2021. № 12. С. 63–70.

А. Л. Аніхоўскі адразу актыўна ўключыўся ў рэалізацыю археалагічных праектаў Інбелкульта. Ён увайшоў у «падкамісію па вывучэньні старога Менску», створаную ў другой палове лістапада 1925 г.[73], і ўжо ў пачатку снежня адзначаў: «Я желал бы принять на себя изготовление плана части окрестностей г. Минска. Мои условия таковы: план размеров ½ × ½ ар. С нанесением на нем курганов, по указанию т. Сербова и с копией, изготовленной на плюре[74], литографской тушью, для печати, будет стоить тридцать рублей»[75]. Менш чым праз два тыдні Інбелкульт накіраваў у штаб стралковага корпуса запіску з просьбай «водпуску… аднаго экзэмпляра карты з гор. Менскам у асяродку у маштабе ў адну вярсту, дзеля неабходных навуковых прац Гістарычна-Археолёгічнай Камісіі ІБК»[76]. У студзені 1926 г. Д. І. Даўгяла паведаміў чытачам часопіса «Наш край», што «плян Старога Менску» А. Л. Аніхоўскім зроблены[77]. У друку дакумент не з'явіўся, а яго лёс застаўся невядомым.

Шматгадовы досвед Аляксандра Лявонцьевіча ў галіне тапаграфіі аказаўся запатрабаваным і падчас экспедыцыі па вывучэнні пячор на Аршаншчыне. У сярэдзіне мая 1926 г. аршанскія школьнікі адкрылі ва ўр. Дубкі[78] невядомыя падземныя лёхі. Мясцовае краязнаўчае таварыства зацікавілася знаходкай і паведаміла аб ёй супрацоўнікам Інбелкульта. Гістарычна-археалагічная камісія направіла на абследаванне помніка сваіх сяброў Д. І. Даўгялу, І. А. Сербава і А. Л. Аніхоўскага. Ужо 2 чэрвеня мінскія спецыялісты прыехалі ў Оршу. Пры дапамозе мясцовых краязнаўцаў і студэнтаў Аршанскага рабочага факультэта яны агледзелі пагорак, пад якім знаходзіліся штучныя скляпенні, выявілі два ўваходы ў пячоры, высветлілі памеры і канструкцыйныя асаблівасці падземных калідораў. А. Л. Аніхоўскі склаў дэталёвы план пячор (мал. 4), І. А. Сербаў зрабіў фотаздымкі. Навукоўцы выказалі здагадку аб тым, што падземныя аб'екты мелі дачыненне да катлавіны, выкапанай на самым версе пагорка. У працэсе раскопак катлавіны быў знойдзены фрагмент жалезнага нажа і «невялікая бляшаная пушачка… як-бы для сьвяцільні». Атрыманыя матэрыялы далі падставу сцвярджаць, што катлавіна ўяўляе сабой рэшткі пабудовы, у якой жыў будаўнік пячор. Сам жа помнік, на думку сяброў Інбелкульта, быў звязаны з Аршанскім Куцеінскім манастыром і мог узнікнуць не раней за другую палову XVII ст.[79]

На пасяджэнні прэзідыума Інбелкульта 15 чэрвеня 1926 г. Д. І. Даўгяла прачытаў даклад аб папярэдніх выніках вывучэння пячор[80]. У той жа дзень у цэнтральных газетах былі надрукаваны абвесткі аб найбліжэйшых планах беларускіх археолагаў. Кіраўніком экспедыцыі, нацэленай на «досьлед даўнейшага гарадзішча "Дзедзіно" ў Калінінскай акрузе», быў названы А. Л. Аніхоўскі[81].

У першыя дні ліпеня Аляксандр Лявонцьевіч адправіўся на Аршаншчыну[82]. У ваколіцах в. Чаркасова[83] знаходзіліся «старасьвецкія курганы»[84], добра вядомыя краязнаўцам. Яшчэ ў лютым 1926 г. тэрыторыя, занятая могільнікам, была перададзена Аршанскаму краязнаўчаму таварыству для «арганізацыі гістарычнага заказьніка». Нельга выключаць верагоднасці таго, што А. Л. Аніхоўскі, як супрацоўнік Інбелкульта, дапамагаў мясцовым актывістам выконваць задачы па «назіраньні і ахове заказьніка»[85].

Археолаг агледзеў могільнік, склаў яго план (мал. 5), вылучыў і апісаў тры віды курганных насыпаў[86]. Ён «шчупом» абследаваў частку помніка, аднак «ничего интересного найдено не было»[87]. Са значна большай увагай адмысловец паставіўся да аповедаў мясцовых жыхароў аб сістэматычным знішчэнні старажытных пахаванняў. Імкнучыся патлумачыць сялянам немэтазгоднасць разбурэння «шведскіх» і «французскіх» магіл дзеля пошуку міфічных скарбаў, Аляксандр Лявонцьевіч вырашыў правесці раскопкі аднаго з курганоў. «Вскрытие насыпи» вялося з дапамогай даволі састарэлай методыкі – шляхам закладання дзвюх траншэй[88]. У кургане былі выяўлены астанкі двух чалавек (паводле пазнейшага вызначэння

[73]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1 Спр. 6. Арк 87 ; *Даўгяла З.* У Інбелкульце. Гістарычна-Археолёгічная Камісія // Наш край. 1926. № 1. С. 54–55.

[74]Плюр – гэта адмысловая тонкая папера, якая выкарыстоўваецца ў літаграфіі.

[75]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 90.

[76]Там жа. Арк. 59.

[77]*Даўгяла З.* У Інбелкульце. Гістарычна-Археолёгічная Камісія. С. 54–55.

[78]Урочышча знаходзіцца ў левабярэжжы р. Днепр, паміж г. Оршай і в. Ларынаўка Крапівенскага сельскага савета Аршанскага раёна Віцебскай вобласці.

[79]*Даўгяла Д. І.* Аршанскія пячоры // Наш край. 1926. № 8–9. С. 45–50 ; *Даўгяла Зьм.* Дзейнасьць Гістарычна-Археолёгічнае камісіі Інстытуту Беларускае культуры ў 1925–1926 акад. годзе // Гіст.-арх. зб. 1927. Вып. 1. С. 366.

[80]*Даўгяла Зьм.* Дзейнасьць Гістарычна-Археолёгічнае камісіі. С. 50 ; ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 23. Арк. 176.

[81]Архэолёгічныя экспедыцыі // Сав. Беларусь. 1926. 15 чэрв. С. 6 ; Археологические экспедиции // Звезда. 1926. 15 июня. С. 4.

[82]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 23. Арк. 153.

[83]Сёння вёска адносіцца да Межаўскага сельскага савета Аршанскага раёна Віцебскай вобласці.

[84]Курганны могільнік, абследаваны А. Л. Аніхоўскім, у далейшым вывучалі А. М. Ляўданскі (1928), Л. В. Аляксееў (1960), М. І. Лашанкоў (1981), В. М. Ляўко (1989). (Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. Т. 2. Л – Я / рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.]. Мінск : БелЭН, 2011. С. 397.)

[85]*Васілеўскі Д.* Ахова помнікаў старажытнасьці. Гістарычны заказьнік // Сав. Беларусь. 1926. 1 мая. С. 5.

[86]ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 213. Арк. 78–82.

[87]Там жа. Арк. 85.

[88]Там жа. Арк. 83–94.




*Мал. 4.* План пячор каля Оршы, складзены А. Л. Аніхоўскім у 1926 г.
К р ы н і ц а: *Даўгяла Д. І.* Аршанскія пячоры // Наш край. 1926. № 8–9. С. 48

*Fig. 4.* Plan of caves near Orsha, drawn by A. L. Anihowski in 1926.
S o u r c e: *Dawgjala D. I.* Orsha Caves // Nash kraj. 1926. No. 8–9. P. 48




*Мал. 5.* План могільніка каля в. Чаркасова, складзены А. Л. Аніхоўскім у 1926 г.
Прыпіска ўнізе аркуша зроблена К. М. Палікарповічам у 1948 г.
К р ы н і ц а: ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 213. Арк. 102

*Fig. 5.* Map of cemetery near the village Charkasova drawn by A. L. Anihowski in 1926.
The post at the bottom of the sheet was made by K. M. Palikarpovich in 1948.
S o u r c e: The Cent. Sci. Arch. of Natl. Acad. of Sci. of Belarus.
Fund of Archaeol. Sci. Documents. Invent. 1. Folder 213. P. 102

А. М. Ляўданскага, гэта былі астанкі жанчыны і дзіцяці, пахаваных па абраду інгумацыі[89]). Падчас раскопак былі знойдзены два гаршкі, прылады працы і ўпрыгожанні (мал. 6). Асаблівасці пахавальнага абраду і інвентар далі А. Л. Аніхоўскаму падставу разважаць аб «крывіцкім паходжанні» кургана[90].




*Мал. 6.* Матэрыялы раскопак кургана № 1 каля в. Чаркасова (малюнкі А. Л. Аніхоўскага).
Крыніца: ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 213. Арк. 101

*Fig. 6.* Materials of the excavation of the barrow No. 1 near the village Charkasova (drawings by A. L. Anihowski)
Source: The Cent. Sci. Arch. of Natl. Acad. of Sci. of Belarus. Fund of Archaeol. Sci. Documents. Invent. 1. Folder. 213. P. 101

Увагу даследчыка прыцягнула і ўмацаванае паселішча, размешчанае паблізу в. Чаркасова[91]. Амаль праз два гады ён адзначаў: «Осмотр городища был произведен вечером, на скорую руку, и хотя были сделаны некоторые измерения яго площади и высоты, но они нуждаются в проверке»[92]. Таксама А. Л. Аніхоўскі паспрабаваў вызначыць магутнасць культурнага слоя: «…копнув в нескольких местах… железной палкой, получил сразу-же черепки от горшков, кости животных и железные шлаки»[93]. Завяршаючы абследаванне помніка, ён прыйшоў да высновы аб тым, што «правильные раскопки… дадут богатые результаты»[94].

У хуткім часе пасля вяртання з Аршаншчыны А. Л. Аніхоўскі накіраваўся ў Калінінскую акругу, адміністрацыйным цэнтрам якой былі Клімавічы. Супрацоўніка Інбелкульта цікавілі ваколіцы в. Стары Дзедзін[95]. У гэтай мясцовасці, як паведамляў часопіс «Наш край», быў знойдзены скарб срэбных манет IX–XI стст.[96] Археолаг адразу пачаў даследаванні, і ўжо 22 ліпеня чытачы выдання «Савецкая Беларусь» даведаліся аб першых выніках гэтай працы[97]. Аляксандр Лявонцьевіч правёў раскопкі чатырох курганоў каля в. Стары Дзедзін[98] і двух курганоў паблізу в. Старыя Пранічкі[99]. «У большасці раскапаных курганоў выяўлена пахаваньне стараславянскага тыпу – праз спальваньне трупаў, а ў некаторых знойдзены шкілеты, якія вельмі добра захаваліся (больш позьняга пэрыяду)», – інфармавала сваіх чытачоў газета[100]. А. Л. Аніхоўскі не абмежаваўся раскопкамі курганоў. Як пазней адзначалі калегі, ён зрабіў «добрыя пляны археолёгічных памятнікаў»[101]. Акрамя таго, у наваколлі в. Стары Дзедзін і в. Раськова[102] Аляксандр Лявонцьевіч выявіў шэраг аб'ектаў – «лейкавідных ям, якія дасягаюць у дыяметры да 34 мэтраў і глыбінёй – да 3 з паловай мэтраў»[103]. Разважаючы над храналогіяй з'яўлення і прызначэннем гэтых ям, навуковец зрабіў даволі смелыя высновы: «…пабудаваньні можна аднесьці да пэрыяду пераходу ад

[89]*Ляўданскі А. Н.* Курганны магільнік каля в. Чаркасова, Аршанскае акругі // Зап. аддз. гуманітар. навук. Т. 2, кн. 2. С. 70.
[90]ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 213. Арк. 94.
[91]Гарадзішча неаднаразова вывучалася спецыялістамі. Яго раскопкі праводзілі С. А. Дубінскі (1928), Л. Д. Побаль (1971), В. М. Ляўко (1989). (Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. Т. 2. Л – Я. С. 397.)
[92]ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 213. Арк. 77.
[93]Там жа.
[94]Там жа.
[95]Сёння вёска адносіцца да Кісялёва-Будскага сельскага савета Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці.
[96]Каштоўная архэлёгічная знаходка // Наш край. 1926. № 6–7. С. 76.
[97]Архэолёгічныя раскопкі // Сав. Беларусь. 1926. 22 ліп. С. 5.
[98]Курганны могільнік, даследаваны А. Л. Аніхоўскім, неаднаразова прыцягваў увагу археолагаў у пасляваенны час. Яго абследавалі Т. М. Каробушкіна (1978), Н. І. Здановіч (1985), В. Ф. Капыцін (1970, 1994). (*Копытин В. Ф.* Археологические памятники Климовичского района Могилевской области. Могилёв : МГУ им. А. Кулешова. 1998. С. 67–68.)
[99]Сёння гэта вёска Кісялёва-Будскага сельскага савета Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці. В. Ф. Капыцін, які абследаваў ваколіцы вёскі ў 1994 і 1996 гг., не выявіў прыкмет курганнага могільніка. (*Копытин В. Ф.* Археологические памятники … С. 69.)
[100]*Копытин В. Ф.* Археологические памятники … С. 69.
[101]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 23. Арк. 175 зв.
[102]Сёння вёска адносіцца да Кісялёва-Будскага сельскага савета Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Паўторнае абследаванне помніка ў 1996 г. ажыццявіў В. Ф. Капыцін. (*Копытин В. Ф.* Археологические памятники … С. 65–66.)
[103]Архэолёгічныя раскопкі. С. 5.

палеоліту да нэоліту. Гэта першае выяўленьне на тэрыторыі Беларусі сьлядоў прабываньня старажытнага чалавека»[104]. Згаданыя меркаванні, як вядома, не былі падтрыманы спецыялістамі. Таксама А. Л. Аніхоўскі агледзеў «крэйдавае напластаваньне» ў ваколіцах в. Стары Дзедзін і сабраў узоры знаходак[105].

Пасля завяршэння палявога сезона Аляксандр Лявонцьевіч пачаў актыўна ўдзельнічаць у навуковым жыцці беларускай сталіцы. Так, 3 лістапада ён выступіў на пасяджэнні сацыяльна-гістарычнай секцыі Інбелкульта (такую назву атрымала гістарычна-археалагічная камісія восенню 1926 г.) з дакладам аб выніках раскопак у ваколіцах «вёскі Чаркасы»[106]. А. Л. Аніхоўскі далучыўся да падрыхтоўкі выставы, якую ў канцы лістапада арганізавалі супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея. На працягу дзесяці дзён дэманстраваліся артэфакты, знойдзеныя беларускімі археолагамі летам 1926 г., у тым ліку інвентар з курганоў Калінінскай акругі і Аршаншчыны, а таксама зробленыя А. Л. Аніхоўскім «дасканалыя зарысоўкі месца раскопак»[107]. У пачатку снежня даследчык прысутнічаў на агульным сходзе гісторыкаў і археолагаў Інбелкульта, дзе У. І. Пічэта выступаў з прамовай аб спрэчных пытаннях беларускай археалогіі[108].

У 1927 г. навуковая актыўнасць А. Л. Аніхоўскага запаволілася. На пасяджэнні сацыяльна-гістарычнай секцыі Інбелкульта 6 студзеня 1927 г. раскопкі ў в. Чаркасова былі ўключаны ў план працы інстытута на новы палявы сезон[109]. Праз некалькі дзён, 19 студзеня, Аляксандр Лявонцьевіч зноў азнаёміў калег з вынікамі даследаванняў на Аршаншчыне, звярнуўшы ўвагу на неабходнасць «провести в возможно большем масштабе раскопки как городища, так и наиболее типичных курганов»[110]. Праз месяц у выданні «Савецкая Беларусь» з'явілася нататка, у якой давалася характарыстыка «гарадзішча курганаў» і акрэсліваліся перспектывы вывучэння помніка ў ваколіцах «в. Чаркасы»[111]. У маі археолаг выступіў перад супрацоўнікамі Інбелкульта з дакладам «Аб медным выліву, прысланым у Музэй В. У. Ластоўскім»[112]. У іншых дакументах галоўнай навукова-даследчай установы краіны, датаваных 1927 г., прозвішча А. Л. Аніхоўскага адсутнічае. У пачатку 1928 г. адмысловец перадаў спецыялістам тэкст свайго даклада аб раскопках каля в. Чаркасова[113].

Адыход А. Л. Аніхоўскага ад археалагічнай дзейнасці быў абумоўлены шэрагам фактараў. Трэба прызнаць, што руплівы даследчык мінуўшчыны не здолеў заслужыць аўтарытэт сярод беларускіх навукоўцаў. Нягледзячы на дыплом МАІ і шматгадовы досвед краязнаўчых даследаванняў, А. Л. Аніхоўскі так і застаўся адукаваным аматарам. М. М. Улашчык безапеляцыйна называў яго «самым дурным вучоным у Менску»[114] і ўзгадваў: «Адзін раз член камісіі Аніхоўскі прывёз планшэт, на якім было нашыта некалькі пляскатых камянёў, кажучы, што гэта помнікі палеаліту; што гэта проста каменьчыкі, ён ніяк не пагаджаўся»[115]. А. М. Ясінскі, якому ў пачатку 1928 г. было даручана напісаць рэцэнзію на тэкст даклада Аляксандра Лявонцьевіча, таксама быў катэгарычным: «Работа А. Л. Аниховского в том виде, как она представлена, не может быть напечатана»[116]. А. М. Ляўданскі, публікуючы ў 1930 г. асноўныя вынікі даследаванняў навукоўца на Аршаншчыне, назваў раскопкі свайго папярэдніка «нядбайнымі» і звярнуў увагу на «супярэчнасьці дзёньніка раскопак з… планам»[117].

Абмежаванні на размах археалагічных даследаванняў накладала і дзейнасць у сістэме Наркамзема БССР. Навуковец скардзіўся: «Службовыя абавязкі не даюць магчымасць разгарнуць працу ў тым напрамку і ў той шырыні, як бы я жадаў»[118]. Па-ранейшаму імкнучыся «прысьвяціць сваю працу археалогіі»[119], у снежні 1927 г. А. Л. Аніхоўскі звярнуўся ў Народны камісарыят асветы (Наркамасветы) БССР з просьбай прыняць яго на пасаду загадчыка Беларускім дзяржаўным музеем[120]. Аднак гэтыя спадзяванні не ажыццявіліся.

Акрамя таго, А. Л. Аніхоўскі не мог пахваліцца добрым здароўем. Хутчэй за ўсё, менавіта «болезненное состояние» вымусіла яго ў студзені 1928 г. канчаткова адмовіцца ад працы ў Мінску і перабрацца ў знаёмы па дарэвалюцыйным часе Аранбургскі край[121].

---

[104]Археолёгічныя раскопкі. С. 5.
[105]*Даўгяла Зьм.* Дзейнасьць Гістарычна-Археолёгічнае камісіі …. С. 366.
[106]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 23. Арк. 153, 176, 178.
[107]Там жа. Арк. 154–155 ; Археолёгічная выстаўка ў Беларускім дзяржаўным музэі // Сав. Беларусь. 1926. 21 ліст. С. 7.
[108]ЦНА НАНБ. Арк. 184–184 зв.
[109]Там жа. Спр. 24. Арк. 169–170.
[110]Там жа. Арк. 188.
[111]Дасьледваньне чаркаскіх курганаў // Сав. Беларусь. 1927. 24 лют. С. 8.
[112]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 23. Арк. 176.
[113]Там жа. Спр. 213. Арк. 76–94.
[114]*Улашчык М. М.* Краязнаўства. Нататкі пра бадзянні ў 1924–1929 гг.: з рукапіснай спадчыны. Мінск : Пейто БелНДІДАС, 1999. С. 23.
[115]*Улашчык М. М.* Даць народу гісторыю: успаміны, лісты. Мінск : Лімарыус, 2016. С. 280.
[116]ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 213. Арк. 103.
[117]*Ляўданскі А. Н.* Курганны магільнік каля в. Чаркасова, Аршанскае акругі. С. 58.
[118]НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1935. Арк. 45 зв.
[119]Там жа.
[120]Там жа.
[121]Філіял ДБУ «АДААВ» у Бугуруслане. Ф. 421. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 5 зв., 6.

## Бугуруслан

Вясной 1928 г. А. Л. Аніхоўскі пасяліўся ў Бугуруслане. Апошняе дзесяцігоддзе жыцця Аляксандра Лявонцьевіча апісана даследчыкамі даволі падрабязна[122] [2; 3, с. 34–35]. Варта тым не менш узгадаць ключавыя эпізоды бугурусланскага перыяду дзейнасці археолага.

Першапачаткова А. Л. Аніхоўскі ўладкаваўся спецыялістам па зямельнай рэгістрацыі пры Бугурусланскім павятовым зямельным упраўленні, а ў кастрычніку 1929 г. звольніўся па ўласным жаданні. У 1930 г. у працоўным спісе даследчыка з'явіўся апошні запіс – пасада выкладчыка чарчэння і геадэзіі ў Бугурусланскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. Сваю педагагічную дзейнасць дасведчаны землямер і тапограф завяршыў 1 верасня 1930 г.[123]

Праца ў землеўпарадкавальнай сферы пакідала дастаткова часу на вывучэнне рэгіёна. У цэнтры інтарэсаў Аляксандра Лявонцьевіча нязменна заставалася археалогія. Запаўняючы дакументы для аддзела кадраў, А. Л. Аніхоўскі прывёў звесткі выключна аб дыпломе МАІ, не ўзгадаўшы ні свой удзел у дзейнасці АВАК, ні працу ў гістарычна-археалагічнай камісіі Інбелкульта. Тым не менш кваліфікацыя «вучоны археолаг», неардынарная для правінцыйнага Бугуруслана, адразу зрабіла А. Л. Аніхоўскага заўважнай і аўтарытэтнай фігурай у асяродку мясцовай інтэлігенцыі.

Амаль адразу пасля прыезду ў Бугуруслан даследчык арганізаваў краязнаўчае таварыства. У жніўні 1928 г. мясцовыя краязнаўцы прапанавалі яму «принять на себя полномочия… по руководству археологической работой в Бугурусланской округе»[124]. У хуткім часе А. Л. Аніхоўскі ініцыяваў маштабнае вывучэнне мясцовых старажытнасцей. Працы вяліся ў адпаведнасці з вызначаным на той час парадкам. Так, да нашых дзён захаваўся дазвол, выдадзены даследчыку Наркамасветы РСФСР у 1929 г.[125] Вынікі даследаванняў адлюстроўваліся ў справаздачах [2, с. 157].

За некалькі год сістэматычнай і мэтанакіраванай дзейнасці А. Л. Аніхоўскі істотна ўдакладніў археалагічную карту рэгіёна. У ваколіцах Бугуруслана ён выявіў некалькі першабытных паселішчаў, у тым ліку помнік мезалітычнага часу «Ярык-1», неалітычную тарфянікавую стаянку каля в. Кірушына, гарадзішча Слабодская гара. Недалёка ад горада быў адкрыты помнік вытворчай дзейнасці старажытных людзей – рэшткі меднай шахты. Археолаг абследаваў дзясяткі адзіночных курганоў, а таксама курганныя могільнікі каля в. Аляксандраўка і в. Пілюгіна. Дзякуючы яго намаганням навуковая супольнасць даведалася аб знаходжанні на тэрыторыі Бугурусланскай акругі дзвюх каменных антрапаморфных скульптур (так званых каменных баб) эпохі Сярэднявечча. А. Л. Аніхоўскі не абмяжоўваўся палявымі даследаваннямі, а імкнуўся асэнсаваць атрыманыя матэрыялы, у першую чаргу вызначыць час функцыянавання помнікаў [2, с. 156–157; 3, с. 34–35].

Як і ў папярэднія гады, важнай часткай сваёй місіі як археолага А. Л. Аніхоўскі лічыў асветніцкую дзейнасць. У жніўні 1929 г. сябры краязнаўчага таварыства даручылі яму адказную справу па арганізацыі акруговага музея і кіраванні ім[126]. Аляксандр Лявонцьевіч ахвотна прыступіў да выканання новых абавязкаў, і ўжо 1 мая 1930 г. Бугурусланскі краязнаўчы музей адчыніў свае дзверы для наведвальнікаў. Аснову музейных фондаў склалі калекцыі, сабраныя ў пачатку XX ст. мясцовым краязнаўцам А. М. Карамзіным. Каштоўнай часткай збораў музея сталі артэфакты, атрыманыя А. Л. Аніхоўскім падчас археалагічных даследаванняў у ваколіцах Бугуруслана. Першапачаткова музей не меў пастаяннага памяшкання, таму дырэктар быў вымушаны вырашаць безліч адміністрацыйна-гаспадарчых задач па пошуку належнага будынка для захавання фондаў і стварэння экспазіцыі [2, с. 156–157].

Нельга, аднак, сцвярджаць, што плённая праца краязнаўца разгортвалася ў спрыяльных умовах. Яго прыезд у Аранбургскі край прыйшоўся на час вялікага пералому, калі савецкае кіраўніцтва ўзяло курс на маштабнае сацыялістычнае будаўніцтва. Змянялася дзяржаўная палітыка і ў сферы культуры. У 1930 г. на хвалі рэпрэсій супраць краязнаўцаў Бугурусланскае краязнаўчае таварыства спыніла сваю дзейнасць. Перад мясцовымі энтузіястамі былі пастаўлены задачы вывучэння перш за ўсё вытворчых сіл і прыродных багаццяў краіны [9]. Аляксандр Лявонцьевіч своечасова адчуў новую грамадска-палітычную кан'юнктуру. «Краеведам нужно заниматься исследовательскими работами во многих областях нашего народного хозяйства, им нужно помогать развитию нашего социалистического строительства, обеспечивать его сырьем», – пісаў ён на мяжы дзесяцігоддзяў (цыт. па [10, с. 249]). Маючы веды ў галіне геалогіі, А. Л. Аніхоўскі на працягу 1930-х гг. паслядоўна рэалізоўваў асноўныя ідэі гэтай праграмы. Разам з калегамі, супрацоўнікамі музея, ён абследаваў каля 130 выхадаў карысных выкапняў, размешчаных у ваколіцах Бугуруслана. Галоўным дасягненнем краязнаўцаў стала выяўленне ў 1935 г.

[122] *Мишанина Е. В.* Оренбургский археолог Александр Леонтьевич Аниховский (1876–1939). С. 337–340 ; *Лившиц В. М.* Имя выпускника Горецких землемерно-таксаторских классов … С. 34–37.
[123] Філіял ДБУ «АДААВ» у Бугуруслане. Ф. 421. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 6 зв. – 7, 9 зв. – 10.
[124] Там жа. Спр. 2. Арк. 1.
[125] Там жа. Арк. 2.
[126] Там жа. Арк. 8 зв. – 9 ; Там жа. Спр. 5. Арк. 3.

паблізу в. Садкі радовішча асфальтытаў – рэдкіх мінералаў, якія спадарожнічаюць нафце[127]. Дзякуючы гэтаму адкрыццю спецыялісты змаглі знайсці ў Волга-Уральскім рэгіёне запасы вуглявадародаў [2, с. 157; 4, с. 101].

У снежні 1930 г. А. Л. Аніхоўскі прыняў удзел у I Усерасійскім музейным з'ездзе[128]. Менавіта падчас гэтага сходу была выпрацавана канцэпцыя, якая прадугледжвала поўнае падпарадкаванне музейных устаноў ідэалагічнаму кантролю з боку дзяржавы. На змену экспазіцыям, якія расказвалі аб шматграннай гісторыі краіны, павінны былі прыйсці выставы, прысвечаныя дасягненням паслярэвалюцыйнага часу [11]. Аляксандр Лявонцьевіч, «истинный хранитель музея» (як яго калісьці назвалі сябры АВАК[129]), імкнуўся рэалізоўваць новыя ўстаноўкі, захоўваючы пры гэтым асветніцкі і адукацыйны характар працы культурнага цэнтра горада. Пры музеі былі адчынены фотастудыя і мастацкі гурток, для ўсіх ахвотных рэгулярна чыталіся лекцыі [2, с. 157–158].

У сакавіку 1939 г. дзейны дырэктар музея прыступіў да фарміравання «індустрыяльнага аддзела»[130]. Давесці гэту справу да канца Аляксандр Лявонцьевіч не паспеў: 14 красавіка 1939 г. яго сэрца спынілася. Свой апошні спачын А. Л. Аніхоўскі знайшоў на старых гарадскіх могілках Бугуруслана[131].

## Заключэнне

А. Л. Аніхоўскі належаў да пакалення тых, каму было наканавана стаць сведкамі і ўдзельнікамі шматлікіх гістарычных пераўтварэнняў першай трэці XX ст. Яму давялося пажыць у розных гарадах сучасных Беларусі і Расіі, і паўсюль ён самаахвярна працаваў у важных сферах народнай гаспадаркі, навукі і культуры. Можна толькі здзіўляцца таму, што большая частка творчай спадчыны Аляксандра Лявонцьевіча зберaглася для нашчадкаў. Дзейнасць выдатнага землямера ўвекавечана на геаграфічнай карце. Шматгадовыя намаганні краязнаўца ў галіне музейнага будаўніцтва таксама не забыты: адзін з двух створаных ім музеяў дагэтуль сустракае наведвальнікаў. Нарэшце, адкрытыя археолагам помнікі мінуўшчыны і сёння выклікаюць цікавасць спецыялістаў.

Імя А. Л. Аніхоўскага займае адмысловае месца ў гісторыі беларускай археалогіі. На працягу некалькіх год – з восені 1925 г. да студзеня 1928 г. – ён з'яўляўся адным з абраных супрацоўнікаў Інбелкульта, сумяшчаючы навуковыя даследаванні з працай у сістэме Наркамзема БССР. Як кваліфікаваны тапограф, Аляксандр Лявонцьевіч складаў план Старога горада ў Мінску. Таксама ён прымаў удзел у абследаванні пячор ва ўр. Дубкі, аглядаў гарадзішча і раскопваў курган у ваколіцах в. Чаркасова на Аршаншчыне, вывучаў курганы каля в. Старыя Пранічкі і в. Стары Дзедзін сучаснага Клімавіцкага раёна на Магілёўшчыне. Акрамя таго, навуковец дбаў аб папулярызацыі археалагічнай спадчыны Беларусі.

А. Л. Аніхоўскі не з'яўляўся выбітным палявым даследчыкам: методыка і вынікі яго працы неаднаразова сустракалі крытыку. Не зрабіў ён унёсак і ў распрацоўку тэарэтычных праблем навукі. Тым не менш не можа не выклікаць павагі яго шчырае захапленне археалагічнай дзейнасцю. Біяграфія Аляксандра Лявонцьевіча ў чарговы раз нагадвае аб тым, што толькі той, хто, нягледзячы на знешнія абставіны, захавае нязломны дух і імпэт да вывучэння старажытнасцей, зможа «прочесть книгу бытия древних насельников и соорудителей… памятников седой старины»[132].

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Тарасевіч В, Грынь Д, складальнікі. *Асоба і помнік. Беларуская археалогія ў фотаздымках 1920–1930-х гг.* Мінск: Белмытсервіс; 2021. 119 с.

2. Гарустович ГН, Кияева НН. Из истории краеведения Оренбургской области: А. Л. Аниховский (1876–1939). *Уфимский археологический вестник*. 2012;12:153–158.

3. Мишанина ЕВ, Лебедева НВ. Историографический очерк археологического изучения Бугурусланского района Оренбургской области. В: Моргунова НЛ, редактор. *Археологические памятники Оренбуржья: сборник научных трудов*. Оренбург: Издательский центр ОГАУ; 2017. с. 34–40.

4. Евгеньев АА. *История оренбургской археологии. Том 1, XVIII век – начало XX века*. Оренбург: Издательский центр ОГАУ; 2018. 364 с.

5. Смирнов Н, Соколов А. Тургайские древности в исследованиях русских археологов до 1917 г. Обзор материалов Императорской археологической комиссии сто лет спустя. В: Базарбаева ГА, Джумабекова ГС, редакторы. *Культура населения Тургая и сопредельных регионов: человек и эпоха*. Алматы: Институт археологии имени А. Х. Маргулана; 2017. с. 207–239.

---

[127]Філіял ДБУ «АДААВ» у Бугуруслане. Ф. 421. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 1–10.
[128]Там жа. Спр. 9. Арк. 3.
[129]Там жа. Спр. 5. Арк. 1.
[130]*Аниховский А. Л.* Откроем в музее индустриальный отдел // Бугурусл. правда. 1939. 4 марта. С 4.
[131]*Мишанина Е. В.* Оренбургский археолог Александр Леонтьевич Аниховский (1876–1939). С. 340
[132]ЦНА НАНБ. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 23. Арк. 188.

6. Зуев ВЮ. Красногорский курган. В: Кривенко ОА, редактор. *Золото, конь и человек*: *сборник статей к 60-летию А. В. Симоненко.* Киев: КНТ; 2012. с. 385–410.

7. Малов НМ. Золотоордынский Укек и Увекское городище. *Известия Саратовского университета. Новая серия. Серия: История. Международные отношения*. 2018;4(18);4:523–527. DOI: 10.18500/1819-4907-2018-18-4-523-527.

8. Аграфонов ПГ. Деятельность Ярославского и Ростовского отделений Московского археологического института. *Ярославский педагогический вестник*. 2004;3(40):198–204.

9. Козлов ВФ. «Огосударствленное» краеведение. История и уроки (по страницам журнала «Советское краеведение». 1930–1936). *Вестник РГГУ. Серия: Литературоведение. Языкознание. Культурология*. 2013;9:53–83.

10. Макеева ЕД. Самарское краеведческое движение 1920-х–1930-х годов и его вклад в изучение и охрану природы Поволжья. *Самарский научный вестник*. 2017;3(6):246–252.

11. Дмитриенко НМ, Лозовая ЛА. Первый музейный съезд как фактор эволюции музейного дела России. *Вестник Томского государственного университета. История.* 2013;6:193–198.

## References

1. Tarasevich V, Gryn' D, compilers. *Asoba i pomnik. Belaruskaja arhealogija w fotazdymkah 1920–1930-h gg.* [A person and a site. Belarusian archaeology in photographs in the 1920s–1930s]. Minsk: Belmytservis; 2021. 119 p. Belarusian.

2. Garustovich GN, Kiyajeva NN. From the history of local lore, history and economy of the Orenburg district: A. L. Anikhovsky (1876–1939). *The Ufa Archaeological Herald*. 2012;12:153–158. Russian.

3. Mishanina EV, Lebedeva NV. [Historiographical sketch of the archaeological study of the Buguruslan area of the Orenburg region]. In: Morgunova NL, editor. *Arkheologicheskie pamyatniki Orenburzh'ya: sbornik nauchnykh trudov* [Archaeological sites of the Orenburg region: collection of scientific papers]. Orenburg: Izdatel'skii tsentr OGAU; 2017. p. 34–40. Russian.

4. Evgen'ev AA. *Istoriya orenburgskoi arkheologii. Tom 1, XVIII vek – nachalo XX veka* [History of Orenburg archeology. Volume 1, $18^{th}$ century – beginning of $20^{th}$ century]. Orenburg: Izdatel'skii tsentr OGAU; 2018. 364 c. Russian.

5. Smirnov N, Sokolov A. [Turgai antiquities in the studies of Russian archaeologists until 1917. A review of the materials of the Imperial Archaeological Commission a hundred years later]. In: Bazarbaeva GA, Dzhumabekova GS, editors. *Kul'tura naseleniya Turgaya i sopredel'nykh regionov: chelovek i epokha* [Culture of the population of Turgay and adjacent regions: man and era]. Almaty: Margulan Institute of Archaeology; 2017. p. 207–239. Russian.

6. Zuev VYu. [Krasnogorsk barrow]. In: Krivenko OA, editor. *Zoloto, kon' i chelovek: sbornik statei k 60-letiyu A. V. Simonenko* [Gold, horse and man: a collection of articles for the $60^{th}$ anniversary of A. V. Simonenko]. Kyiv: KNT; 2012. p. 385–410. Russian.

7. Malov NM. The golden horde city of Ukek and the Uvek settlement site. *Izvestiya of Saratov University. New series. Series: History. International relations*. 2018;4(18):523–527. Russian. DOI: 10.18500/1819-4907-2018-18-4-523-527.

8. Agrafonov PG. [The activities of the Yaroslavl and Rostov departments of Moscow Archaeological Institute]. *Yaroslavl Pedagogical Bulletin*. 2004;3(40):198–204. Russian.

9. Kozlov VF. «Governmentalisyng» local history. History and Lessons (the pages of the magazine «Soviet kraevedenie». 1930–1936). *RGGU Bulletin. Series: Literary Theory. Linguistics. Cultural Studies*. 2013;9:53–83. Russian.

10. Makeeva ED. Samara regional movement 1920s–1930s and his contribution to the study and conservation on the middle Volga region. *Samara Journal of Science.* 2017;3(6):246–252. Russian.

11. Dmitrienko NM, Lozovaya LA. [The first museum congress as a factor of the evolution of the museology in Russia]. *Tomsk State University Journal of History*. 2013;6:193–198. Russian.

*Статья поступила в редколлегию 20.03.2023.*
*Received by editorial board 20.03.2023.*